Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
УО "Белорусский государственный университет культуры и искуств"

**УТВЕРЖДАЮ**
Первый проректор
УО «Белорусский государст-
венный университет культуры и
искусств»
_________________Бондарь Ю.П.

«_____»_________2010г.

Регистрационный
№ УД-__________/уч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАСЦЮМ

**Вучэбная праграма**
**Па спецыялізацыі 1-18 01 01- 01 хоровая музыка (народная), па спецыялізацыі 1-18 01 01 -02 "спевы (народныя)"**

Мінск 2010

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Шчадрына Э.В., выкладчук кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

**РЕЦЕНЗЕНТЫ :**

**РЕКОМЕНДОВАНА К УТВЕРЖДЕНИЮ :**

Кафедрой беларусского народно-песенного творчества
(название кафедры – разработчика программы)
(протокол № 2 ад 07.09.2012г);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказная за выпуск - Шчадрына Э.І.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Рабочая праграма «Беларускі народны касцюм» распрацавана для студэнтаў спецыялізацый «Спевы (народныя)» спецыяльнасці «Спевы» і «Харавая музыка (народная)» спецыяльнасці «Харавая музыка».

Курс па выбару «Беларускі народны касцюм» створаны ў дапамогу студэнтам беларускай народна-песеннай кафедры, якія займаюцца традыцыйнай музыкай, спевамі і харэаграфіяй. Народнае адзенне – гэта таксама яркі здабытак народнай культуры, які, разам з мовай, найбольш ярка адлюстроўвае нацыянальную спецыфіку беларусаў. Традыцыйнае адзенне беларусаў добра ўпісваецца ў ландшафт і пейзаж нашай зямлі, адпавядае вясковым інтэр'ерам з іх самабытнай мэбляй, ручнікамі, абрусамі. Дэкор касцюма беларускіх сялян суладны з пяшчотнай мелодыяй народнай песні, мяккай пластыкай нацыянальнага танца, строгай велічнасцю драўлянага дойлідства. Таму, людзям, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю ў галіне народнага мастацтва, трэба разглядаць фальклор як з'яву сінкрэтычную, дзе этнафонія рэгіянальных спеваў немагчыма без моўных дыялектаў пэўнай мясцовасці, арнаментыкі ручнікоў і вонкавага выгляду яе жыхароў.

**Мэта курса** – засваенне выгляду традыцыйных рэгіянальных строяў, іх алметнасцей і традыцыйных крояў.

**Задачы курса:**

- азнаямленне з беларускімі касцюмамі розных рэгіёнаў;
- адрозненне будзённага адзення ад святочнага;
- мужчынскія і жаночыя строі;
- засваенне асноўных крояў мужчынскага і жаночага традыцыйнага адзення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спецыяліст павінен ведаць:**

- асноўныя тэарэтычныя паняцці,
- традыцыйныя назвы прадметаў народнагакасцюма жаночага і мужчынскага;
- выгляд і камплектацыю рэгіянальных касцюмаў;
- традыцыйныя кроі народнага адзення;
- метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па вывучэнні і ўвасабленні традыцыйнага касцюма ў аматарскай творчасці;

**умець:**

- умець адрозніваць паняцці “касцюм” і “адзенне”;
- аналізаваць мясцовы стыль крою, вышыўкі і камплектацыі народнага строя пэўнага рэгіёна;
- маляваць праекты традыцыйнага касцюма свайго рэгіёну, а таксама праекты сцэнічных касцюмаў на аснове традыцыйных;
- аналізаваць даследча-фалькларыстычныя крыніцы інфармацыіі па беларускаму народнаму касцюмц з мэтай іх адаптацыі ў практычнай фалькларыстыцы;
- умець апранаць і насіць беларускі народны касцюм.

Курс складаецца з лекцыйных і практычных заняткаў.

Тэхналагічны інструментарый выкладання дысцыпліны прадстаўлены наступнымі педагагічнымі метадамі навучання:

1. па крыніцы перадачы і ўспрымання інфармацыі: вусныя (гутарка, апавяданне), наглядныя (знаёмства з дэпаніраваным навукова-метадычным фондам, з аўдыё-відэа матэрыяламі), практычныя (пісьмовыя аналітычныя работы і вучэбна-метадычныя распрацоўкі);

2. па характары пазнавальнай і праектнай дзейнасці: рэпрадуктыўныя, прадуктыўныя, пошукавыя, творчыя;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. па відах вучэбных заняткаў і дыдактычнай задачы: тлумачэнне, практыкаванне, аналіз, замацаванне.

Усяго гадзін па дысцыпліне – 14. Аўдыторных – 13, наведванне музея – 1, лекцыйных – 4, практычных заняткаў – 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва раздзела, тэмы | | Кольк ауд занят |
|---|---|---|---|
| **Тэма 1** | Агульная характарыстыка беларускага народнага касцюма, і вытокі яго фарміравання. | | 2 |
| **Тэма 2.** | Тканіны, колеры, арнаментыка, вышыўка. | | 6 |
| **Тэма 3.** | Асноўныя віды адзення. Плечавое і паяснае адзенне. Традыцыйныя крої. | | 4 |
| **Тэма 4.** | Галаўныя уборы, упрыгожванні і рэчы туалету. Абутак. | | 2 |
| **Тэма 5.** | Сялянскі касцюм і яго рэгіянальныя асаблівасці. | | 2 |
| **Тэма 6.** | Народныя строі Віцебскага Падзвіння. Народныя строі Магілёўкага Падняпроўя. | | 2 |
| **Тэма 7.** | Народныя строі Брэсцкага Палесся. Народныя строі Гомельскага Палесся. | | 2 |
| **Тэма 8.** | Народныя строі Гродзенскага панямоння і Цэнтральнай Беларусі. | | 2 |
| **Тэма 9.** | Касцюм гараджан. Касцюм знаці. | | 2 |
| Тэма 10. | Музейныя калекцыі беларускага народнага адзення. | | 4 |
| Усяго | | | 28 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ КУРСА

## Тэма 1.Агульная характарыстыка беларускага народнага касцюма і вытокі яго фарміравання.

Народнае адзенне – яркі здабытакнацыянальнай культуры Беларусаў. Напрацягу стагоддзяў у беларускага сялянства склаўся даволі ўстойлівы і характэрны комплекс традыцыйнага адзення, які фарміраваўся пад уплывам кліматычных, гістарычных і сацыяльна-эканамічных умоў жыцця. Складальнікі комплексу мужчынскага і жаночага адзення беларусаў. Эвалюцыя народнага адзеня (уплыў гарадскога касцюма на народны).

## Тэма 2.Тканіны, колеры, арнаментыка, вышыўка.

Прадзенне і ткацтва на Беларусі. Афарбоўка нітак і іх чаргаванне ў ткацтве. Асноўныя тканіны і іх колеры (фарбы). Семантыка колераў. Вышыўка. Кампазіцыйня варыянты размяшчэння вышыўкі на адзенні. Арнамент на адзенні: семантыка і рэгіянальныя асаблівасці.

## Тэма 3.Асноўныя віды адзення. Плечавое і паяснае адзенне.Традыцыйныя крої.

Ільняная кашуля і паяснае адзенне (панёва ў жанчын і порткі ў мужчын) – галоўныя часткі адзення беларусаў. Традыцыйныя крої мужчынскіх і жаночых кашуль. Панёва, плахта, спадніца, сарафан і фартух і – віды жаночага паяснога адзення. Порткі – від мужчынскага паяснога адзення, іх крої. Верхняе адзенне мужчын і ханчын: світы, вілайнэ, кажухі, шубы. Спосабы зашпільвання верхняга адзення (гузікі, фібулы). Плашч – від верхняга адзення заможных людзей (корзна, прывалока, ватола, луда, мятль, кіса). Паясы розных слаёў насельніцтва. Сімвалічнасць паясоў.

## Тэма 4. Галаўныя уборы, упрыгожванні і рэчы туалету. Абутак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жаночыя галаўныя ўборы – важнейшая частка касцюма. Жаночыя (чапец, намітка, павой ) і дзявочыя (вянок) галаўныя ўборы . Адрозненне галаўных убораў гараджанак і вясковых жанчын. Упрыгожванні галаўных убораў і адзення у цэлым.  Мужчынскія галаўныя уборы (шапка). Жаночыя і мужчынскія прычоскі. Скураныя дэталі касцюма (кашалькі, футаралы для ножыкаў-амулетаў, чахол ад грабенчыка, скураныя паясы) і абутак (поршні, чаравікі, боты, сандалі, туфлі і інш.).

**Тэма 5.Сялянскі касцюм і яго рэгіянальныя асаблівасці.**

Найбольш ярка рэгіянальныя асаблівасці праглядаюцца ў вясковых жаночых касцюмах. Чатыры асноўныя комплексы (і іх разнавіднасці) жаночага адзення паводле таго, з чым насілася кашуля. Адметныя строі *Брэсцкага Палесся* (Кобрынскі, Пінска-Івацэвіцкі, Дамачоўскі, Мотальскі, Маларыцкі), *Гомельскага Палесся* (Калінкавіцкі, Брагінскі, Турава-Мазырскі, Давыд-Гарадоцка-Тураўскі), *Магілёўскага Прыдняпроўя* (Магілёўскі, Буда-Кашалёўскі, Краснапольскі, Неглюбскі), *Цэнтральнай Беларусі* (Пухавіцкі,Капыльска-Клецкі,Слуцкі, Вілейскі, Ляхавіцкі), *Гродзенсага Панямоння* (Ваўкавыска-Камянецкі, Навагрудскі, Мастоўскі), *Віцебскага Паддзвіння* (Дубровенскі, Лепельскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 6. Народныя строі Віцебскага Падзвіння. Народныя строі Магілёўкага Падняпроўя.**

*Віцебскае Паддзвінне*. Найменьшая захаванасць традыцыйнай формы адзення. Уплыў гарадскога касцюма. Асноўны комплекс – з прышыўным ліфам, у асобных рэгіёнах – сарафан. Абавязковы фартух. Характарыстыка асноўных строяў.

*Магілёўскае Прыдняпроўе.* Змешаны тып касцюма як вынік тэрытарыяльнага знаходжання рэгёна на скрыжаванні беларускіх, рускіх і украінскіх земляў . Адметнасці : тэхніка ўзорыстага ткацтва (закладная), вышыўкі (гафт, тамбурнае шво), прыём маршчэння (збіранне тканіны ў гафрыраваныя складкі). Дрэвы жыцця ў арнаментах Вышыўка чырвонага або чырвона-чорнага колеру суедзіць з з белым ці чорным узорам на серабрыста-белым фоне палатна. Характарыстыка асноўных строяў.

**Тэма 7.Народныя строі Брэсцкага Палесся. Народныя строі Гомельскага Палесся.**

*Брэсцкае Палессе.* Заходне-палескі касцюм - жамчужына беларускага народнага мастацтва. Захаванасць  народных ўбораў, самой традыцыі апранацца ў самаробнае, маляўніча аздобленае адзенне. Адметныя прадметы брэсцкіх убораў: цяжкая, з воўны спадніца – бурка; наміткі - платы, якія насілі маладзіцы; галаўныя ўборы з пукамі фарбаванага пер'я ("рожкі" ці "кветкі"), што насілі свахі на вяселлі.

*Гомельскае Палессе.* Багаццем сродкаў мастацкага афармлення касцюма, разнастайнасцю старадаўніх і сучасных форм Усходняе Палессе не ўступае Заходняму. Вобразна-пластычнымі асаблівасцямі адзення яно блізкае да Цэнтральнай Беларусі і Прыдняпроўя.

Характарыстыка асноўных рэгіянальных строяў Палесся.

**Тэма 8.Народныя строі Гродзенскага Панямоння і Цэнтральнай Беларусі.**

*Цэнтральнай Беларусі.* Стрыманасць і паэтычнасць нацыянальнага касцюма. Пазбяганне знешняй эфектнасці і імпазантнасці вырабаў, імкненне да ўнутранай цэльнасці, гатычнай манументальнасці і тонкай выразнасці ансамбля. Характарыстыка асноўных строяў.

*Гродзенскае Панямонне.* Касцюм Панямоння мае шмат агульнага з цэнтральнабеларускім. Назіраецца схільнасць, асабліва ў паясным адзенні, да зялёнага і валошкавага колераў. Уплыў гарадской моды, што адбілася ў спецыфіцы верхняй вопраткі. Характарыстыка асноўных строяў.

**Тэма 9. Касцюм гараджан. Касцюм знаці.**

Агульня рысы беларускіх касцюмаў знаці і гараджан з усходнееўрапейскім адзеннем.

*Касцюм гараджан.* Тканіны шарсцяныя і льняныя тканіны. Зімовае адзенне з футра авечкі, казы, мядзведзя. Прываznвя тканіны (шоўк). Выявы Радзівілаўскага летапісу як крыніца ўяўлення аб гарадскім адзенні беларусаў. Заходнееўрапейскі тып адзення. Металічныя і шкляныя этнавызначальныя ўпрыгожванні гараджан.

*Касцюм знаці.* Хітон – шырокае доўгае адзенне знатных жанчын. Тасьма, бахрама і упрыгожванні з каштоўных камянёў як аздабленне касцюмаў знатных спадарыньВерхняе кароткае адзенне з шырокімі рукавамі, якое падпярэзвалася поясам. Верхні плашч-накідка, падбіты мехам. Вышыўка залатымі ці срэбранымі ніткамі. Зімовае адзенне знаці, галаўныя ўборы і жаночыя прычоскі . Упрыгожванні знатных людзей на Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 10.Музейныя калекцыі беларускага народнага адзення.**

Прагляд калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі , а таксама альбома з калекцыяй народнага адзення Веткаўскага музея народнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная

1. Бялявіна, В.М. Жаночы касцюм на Беларусі / В.М.Бялявіна, Л.В.Ракава. – Мінск: Беларусь, 2007. – 351 с.: іл.
2. Віннікава, М.М. Скарбы з вясковых куфраў: Традыцыёны касцюм і тэкстыль з калекцыі “Народнае мастацтва Беларускага Палесся”: ілюстраваны каталог / М.М.Віннікава, П.А.Богдан. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2009. – 184 с.: іл.
3. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст.: (паводле археал. звэтсатк) / Л.У.Дучыц; Пад рэд. Г.В.Штыхава. – 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 80 с.: іл.
4. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
5. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
6. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б.Варфаламеева, В.І.Басько, М.А.Козенка і інш. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 797 с.: іл., нот. іл.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне. / Т.Б.Варфаламеева, А.М.Боганева, М.А.Козенка і інш.; Складальнік Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 910 с.: іл., нот. іл.
9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А.М.Боганева [і інш.]; аўт. ідэі Т.Б.Варфаламеева; агул. рэд. Т.Б.Варфаламеевай. – Мн.: Выш. шк., 2006. – 736 с.: каляр. іл.
10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А.М.Боганева [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б.Варфаламеевай. – Мн.: Выш. шк., 2009. – 863 с.: каляр. іл., 1 электрон.-апт. Дыск (CD-Rom).
11. Фальклор беларускі. Адзенне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://falklor.at.tut.by/adzenne/index.htm. – Дата доступу: 3.01.2012.
12. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. –Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дадатковая


1. Веткаўскі музей народнай творчасці: Альбом. / Склад. Г.Р.Нячаева, С.І.Лявонцьева, Ф.Р.Шкляраў. – Мн.: Беларусь, 1999. – 120 с.: іл.
2. Высоцкая, Н.Ф. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII – XVIII стагоддзяў: Альбом / Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 1984. – 236 с.: іл.
3. Ганцавіцкі краязнаўча-інфарматыўны партал. Адзенне. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.gants-region.info/index/adzenne/0-1639. – Дата доступу: 3.01.2012.
4. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pawet.net/library/history/bel_history/dk/01/%D0%9A%D0%B0%D1%81%D1%86%D1%8E%D0%BC_%D0%B6%D1%8B%D1%85%D0%B0%D1%80%D0%BE%D1%9E_%D0%91%D0%B5%D0%BB%D0%B0%D1%80%D1%83%D1%81%D1%96_%D0%A5-%D0%A5%D0%86%D0%86%D0%86_%D1%81%D1%82%D1%81%D1%82..html. – Дата доступу: 3.01.2012.
5. Лабачэўская, В.А. Повязь часоў – беларускі ручнік: Альбом / В.А.Лабачэўская. –Мн.: Беларусь, 2002. – 232 с.: іл.
6. Народныя касцюмы Цэнтральнай Беларусі і Нёманскага рэгіёна [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vialejka.org/print:page,1,2396-yak-vyglyadae-kascyum-vilejchuko-u-parananni-z-inshymi.html. – Дата доступу: 3.01.2012.
7. Раманюк, М. Агульная характарыстыка беларускага народнага адзення [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://jivebelarus.net/our-heritage/Byelorussian-national-dress.html?page=2. – Дата доступу: 3.01.2012.
8. Раманюк, М. Асноўныя комплексы і лакальныя разнавіднасці беларускага народнага адзеня [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://jivebelarus.net/our-heritage/Byelorussian-national-dress.html?page=3. – Дата доступу: 3.01.2012.
9. Раманюк, М. Беларускія народныя строі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://jivebelarus.net/our-heritage/Byelorussian-national-dress.html#lnk0. – Дата доступу: 3.01.2012.
10. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М.Сахута. – Мн.: БелЭн, 1997. – 287 с.: іл.
11. Целеш, Л. Спадчына Міхася Раманюка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.novychas.org/culture/%D1%81%D0%BF%D0%B0%D0%B4%D1%87%D1%8B%D0%BD%D0%B0-%D0%BC%D1%96%D1%85%D0%B0%D1%81%D1%8F-%D1%80%D0%B0%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D1%8E%D0%BA%D0%B0. – Дата доступу: 3.01.2012.
12. Этналогія Беларусі. Тэарэтычны курс. Лекцыя 10. Абутак [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ethno.iatp.by/2/e04e.htm. – Дата доступу: 3.01.2012.
13. Этналогія Беларусі. Тэарэтычны курс. Лекцыя 10. Беларускі касцюм. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ethno.iatp.by/2/e04a.htm. – Дата доступу: 3.01.2012.
14. Этналогія Беларусі. Тэарэтычны курс. Лекцыя 10. Жаночае адзенне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ethno.iatp.by/2/e04c.htm. – Дата доступу: 3.01.2012.
15. Этналогія Беларусі. Тэарэтычны курс. Лекцыя 10. Мужчынскае адзенне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ethno.iatp.by/2/e04b.htm. – Дата доступу: 3.01.2012.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭКСТЫ ЛЕКЦЫЙ

## Тэма 1.
## Агульная характарыстыка беларускага народнага касцюма і вытокі яго фарміравання.

**Пытанні да тэмы:**

1. Беларускі народны касцюм як праява нацыянальнай спецыфікі беларусаў.
2. Агульная характарыстыка беларускага народнага адзення.
3. Традыцыйны комплекс жаночага і мужчынскага народнага адзення.

---

1. Кожнаму пакаленню застаецца ў спадчыну тое, што стварылі талент і працалюбства бацькоў, продкаў, тое, што выяўляе нацыянальнае аблічча народа, яго душу, яго імкненні, тое, што кожнае пакаленне павінна шанаваць і памнажаць.

"Усе народы,- пісаў В. Р. Бялінскі,- таму толькі і ўтвараюць сваім жыццём адзін агульны акорд сусветна-гістарычнага жыцця чалавецтва, што кожны з іх уяўляе сабою адметны гук у гэтым акордзе, бо з зусім аднолькавых гукаў не можа выйсці акорд" .
Свая, цудоўная спадчына ў беларускага народа. Стагоддзямі, узбагачаючы і ўдасканальваючы, нягледзячы на цяжкія гістарычныя ўмовы, на ліхалецці войнаў, выраблялі беларусы ўзоры народнага мастацтва, у якім сцвярджалі свой эстэтычны ідэал, у якое ўкладвалі тонкі густ і высокае майстэрства. Адыходзіла і гублялася многае - лёс не песціў беларусаў. Але і тое, што засталося, раскрывае перад нашым сучаснікам па-мастацку дзівосны, па-філасофску мудры свет народа - пранікнёнага творцы і ашчаднага хавальніка лепшага, таленавітага. Беларуская народная творчасць - паэма жыцця беларускага народа на ўсіх этапах гісторыі, трапяткое люстра яго душы, невычэрпная крыніца творчага натхнення і мастацкіх вобразаў.

Яркім здабыткам нацыянальнай культуры Беларусі з'яўляецца народнае адзенне. Сфарміраванае ў выніку доўгіх і складаных працэсаў развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, яно больш, чым іншыя сферы побыту, адлюстроўвае нацыянальную спецыфіку беларусаў. Таму лічыцца, што пасля мовы народнае адзенне - найважнейшая этнічная прыкмета. Глыбока і паэтычна выказала гэта простая беларуская сялянка. Яна хоча быць пахаванай ва ўборы сваёй маладосці, каб, паводле яе прыгожай фантазіі, продкі пазналі, "хто яна, хто мы як народ".

Сапраўды. Калі мы кажам "беларус, грузін, іспанец", то абавязкова хочам уявіць, як ён выглядае, як апрануты. Альбом "Беларускае народнае адзенне" і пакажа нам саміх сябе, пакажа ўсім, хто зацікавіцца, як выглядалі, як апраналіся беларусы, працоўныя людзі адной са славянскіх нацый. І поўныя ансамблі адзення, і кожная з яго частак - гэта, з аднаго боку, рэчы утылітарнага прызначэння, з другога - творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Народ заўсёды, ва ўсім - мастак. Усякі выраб яго рук адухоўлены шчырасцю пачуцця, расквечаны цікавай выдумкай. Пры гэтым ён практычна і эстэтычна мэтазгодны, пазбаўлены выпадковага, штучнага. Таму творы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ва ўсе часы былі і застаюцца бясспрэчнымі ўзорамі сапраўднага мастацтва, дзейсна ўплываюць на сучасную культуру, на яе далейшае развіццё і ўзбагачэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна народным уяўленням, прыгажосць жанчыны заўсёды атаясамлівалася не толькі са знешнім выглядам, але і з яе працавітасцю, умельствам, густам. Калі надыходзіла пара выходзіць замуж, дзяўчына рыхтавала бацькоўскай сям'і і жаніховай радні багата аздобленыя кашулі, наміткі, паясы, ручнікі. Гэтым яна сведчыла свае здольнасці, рупнасць, кравецкі і вышывальны спрыт. У народных песнях хлопцу раіцца, якую дзяўчыну браць за жонку:

І не выбірай, Ясю, каторая гладка,
Сам глядзі, у людзей пытай, чы мецена хатка.
Не ўважай, Ясеньку, каб была росла,
Сам глядзі, у людзей пытай, чы ўмее ткаць кросна.
Не глядзі, Ясю, чы ў пацёрках шыя,
Сам глядзі, у людзей пытай, чы кашулю ўшые...
Не ўважай, Ясю, чы пекне ў танцу ходзіць,
Сам глядзі, у людзей пытай, чы усенько зробіць.

Дэкор касцюма беларускіх сялян суладны з пяшчотнай мелодыяй народнай песні, мяккай пластыкай нацыянальнага танца, строгай велічнасцю драўлянага дойлідства. Цесная ўзаемасувязь і танальная зладжанасць мастацтва народнага касцюма з усімі праявамі творчай дзейнасці беларускага сялянства, з абрадамі, звычаямі - адна з самых яго вызначальных рыс. Як і ў іншых відах народнага мастацтва, у традыцыйным касцюме мы назіраем тэктанічную яснасць і пластычную выразнасць, паэтычную сілу і ліра-эпічную напружанасць. Маляўніча аздоблены, ён хараша ўпісваўся ў беларускі пейзаж, адпавядаў інтэр'еру сялянскай хаты з яго самабытнай мэбляй, ручнікамі, абрусамі.

Гістарычнае развіццё беларускага народнага адзення адбывалася ў непасрэднай сувязі з прыродна-кліматычнымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі. Засцерагаючы чалавека ад холаду і спёкі, адзенне адпавядала таксама маральным патрабаванням, задавальняла эстэтычныя густы. У розныя часы і па-рознаму яно выконвала магічную і абрадавую функцыі, служыла сродкам адрознення паводле сацыяльнага паходжання, роду заняткаў. Па састаўных частках касцюма, спосабу нашэння, па кампазіцыйна-дэкаратыўнаму афармленню, каларыту і арнаментыцы можна было дазнацца, з якой

2. **Беларускае народнае адзенне** фарміравалася на працягу стагоддзяў. Але асноўныя яго віды і састаўныя часткі, спосабы пашыву і кампазіцыйныя рашэнні, каларыстычныя і арнаментальныя асаблівасці пачалі складвацца з канца XIII ст. адначасова з фарміраваннем беларускай народнасці. Касцюм беларусаў развіваўся ў кантакце з касцюмамі рускіх, украінцаў, а таксама літоўцаў, палякаў, іншых народаў, і поруч са сваімі нацыянальнымі рысамі ён узбагачаўся іншанацыянальнымі.

У часы панавання стылю готыкі ўзнікла тэхніка крою, удасканальвалася кравецкае рамяство, што азначыла цэлы этап у гісторыі касцюма, у тым ліку беларускага. Нескладаныя канструкцыі і простыя сілуэты перыяду Кіеўскай Русі саступілі месца прынцыпова новым. У святочным, а потым і ў будзённым гарнітуры замацаваліся андарак, гарсэт, намітка. Кашуля ўскладнілася распрацоўкай крою, адкладным каўняром, світа - вытачкамі для стварэння аб'ёму, авальным падкроем праймы і аката рукавоў. Змясціліся акцэнты дэкору, а сам ён стаў больш разнастайны і вытанчаны. Усё гэта было крокам наперад у секулярызацыі касцюма ад хрысціянскіх догмаў, ад іх патрабавання старанна хаваць цела. Набліжаны да абрысаў чалавечай фігуры, эстэтычна змястоўны, ён адпавядаў духу рэнесансавага светаўспрымання. Беларускі касцюм XVI ст. меў характэрныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкметы касцюма эпохі Адраджэння, а з найбольш спецыфічных - тэндэнцыі да агульнай строгасці ансамбля, перавагі спалучэння белага з чырвоным у каларыстыцы, геаметрычных узораў у арнаментыцы. Беларускі касцюм набыў завершанасць як цэласная сістэма, свой утылітарны і мастацкі вобраз.

Далейшае яго развіццё ад XVII да сярэдзіны XIX ст. ішло не па шляху карэнных пераўтварэнняў, а па шляху тых ці іншых змен, звязаных з мадыфікацыяй элементаў адзення, насычэннем каляровай гамы, пераасэнсаваннем арнаментальных матываў, замацаваннем рэгіянальных адметнасцей. Аднак развіццё не было прасталінейным. Яно адбывалася ва ўмовах разлажэння феадальнага ладу і станаўлення капіталістычных адносін. У другой палове XIX ст., а ў раёнах з больш трывалым патрыярхальным укладам к канцу XIX - пачатку

XX ст., разам з фарміраваннем беларускай буржуазнай нацыі яшчэ больш выразна акрэсліваецца этнаграфічнае аблічча беларускага народнага адзення як важнага паказчыка нацыянальнай культуры. Менавіта касцюм беларускіх сялян гэтай пары выступае як традыцыйны, класічны ўзор народнага мастацтва. Аднатыпны для ўсёй Беларусі, ён разам з тым мае шэраг лакальных разнавіднасцей - строяў.

Сярэднекантынентальны клімат беларускага краю вымагаў адносна цёплага і закрытага адзення. Матэрыял для яго давала мясцовая сыравіна - лён, радзей каноплі, воўна ў натуральнай і паўнатуральнай сялянскай гаспадарцы, вытканая ў хатніх умовах, на кроснах. Фарбавалі прыроднымі фарбавальнікамі - настоямі траў, кары, лісця і шышак дрэў, балотнай жалезнай рудой. Ільняныя тканіны, якія ішлі на кашулі, фартухі, галаўныя ўборы, не фарбаваліся. Белае палатно аздаблялі звычайна чырвоным геаметрычным арнаментам, які рабіўся натыканнем ці вышыўкай. У старажытнасці чырвоны колер сімвалізаваў жыццё, а нанесены з дапамогай арнаменту на каўнер, разрэз пазухі, рукавы, ніз адзежыны служыў засцерагальным знакам. Ён жа адыгрываў істотную кампазіцыйную ролю, яднаючы часткі адзення ў мастацкае цэлае. Паліхромнасць уласціва суконным і паўсуконным тканінам паяснога адзення, а таксама поясу. Тут вышыўка амаль адсутнічае, а тканы ўзор вызначаецца сакавітасцю тонаў, смеласцю іх спалучэнняў - чырвоны, зялёны, сіні, белы. Удала выкарыстоўваліся ў аздобе касцюма натуральныя серабрыстыя тоны льну і воўны. З другой паловы XIX ст. са з'яўленнем анілінавых фарбавальнікаў і фабрычных нітак спектр колераў дапоўніўся аранжавым, фіялетавым, блакітным, малінавым, ярка-зялёным.

3. Традыцыйны комплекс мужчынскага адзення складаўся з палатнянай кашулі, нагавіц, камізэлькі. Кашулю насілі навыпуск, падпяразвалі поясам, калошы абкручвалі анучамі, абувалі лапці, скураныя пасталы, пазней - боты. Галаўным уборам былі саламяны капялюш ці валеная магерка. Закончанасць ансамблю прыдавала скураная сумачка-шабета, якую падвешвалі цераз левае плячо ці да пояса. Мужчынскі касцюм сціплы паводле аздаблення. У ім пераважаў белы колер, а дэкор прыпадаў на каўнер, пазуху кашулі і перш-наперш на кідкі ў вочы рознакаляровы пояс з кутасамі.

Асабліва высокага ўзлёту фантазіі і майстэрства мастацтва беларускага народнага адзення дасягнула ў жаночым касцюме. Самабытнасць яго вызначае самабытнасць нацыянальнага касцюма беларусаў увогуле. Так, найважнейшая частка адзення - кашуля, якую насілі ў любым узросце, сацыяльным і сямейным становішчы, у будні і святочны дзень,- увабрала ў сябе, як у фокус, характэрныя канструкцыйныя прыёмы і дэкаратыўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпы беларускага касцюма. У залежнасці ад крою ў жаночай кашулі вылучаюцца тры асноўныя тыпы: тунікападобная; з прамымі плечавымі ўстаўкамі; з гесткай. Каля адкладнога, радзей стаячага каўняра тканіна прызбіралася і аблягала шыю, а спераду каўнер завязваўся чырвонай жычкай або зашпільваўся на шпонку ці гузік; прызбіраўся на каўнерац і ніз рукава. Найбольшую ўвагу звярталі на ўпрыгожанне рукавоў, што звязана з мастацкай тэктонікай і пластыкай касцюма, а таксама з верай у магічную, сілу чырвонага рамбічнага арнаменту, які нібыта засцерагаў рукі ад злых духаў, надаваў моц і дужасць як асноўным у працы.

Разнастайнае паясное адзенне беларускіх жанчын: многія віды спадніц (андарак, палатнянік, саян, летнік), панёвы, фартухі. Іх кроілі з некалькіх прамавугольных полак і багата аздаблялі. Дэкаратыўны малюнак спадніцы і панёвы - клетка, падоўжныя або папярочныя палосы ў чырвоным, сіне-зялёным ці серабрыста-белым каларыце.

Кампазіцыйна-арнаментальнае вырашэнне фартуха адпавядала вырашэнню кашулі і гарманізавалася з ёю. Апрача таго, фартух упрыгожваўся карункамі, махрамі і быў прыкметнай часткай касцюма. У жаночае, асабліва святочнае, убранне ўваходзіў таксама гарсэт. Звычайна ён меў выгляд кароткай безрукаўкі, якая шчыльна абхоплівала стан і рабіла фігуру зграбнай і жаноцкай. Шылі гарсэт пераважна з мануфактурных тканін (аксаміт, парча, шоўк) чорнага, блакітнага, малінавага колеру, кроілі з глыбокім выразам пазухі і баскай па нізе, якая вырашалася фальбонамі ці клінамі, аздаблялі нашыўкамі стужак, тасёмак, гузікаў.

Абавязковым элементам комплексу быў рознакаляровы, звычайна чырвона-зялёна-белага арнаменту, пояс - тканы, плецены ці вязаны, з кутасамі, махрамі або пампонамі. Прычоскі і галаўныя ўборы строга залежалі ад узросту і сямейнага становішча жанчыны. Традыцыйная прычоска дзяўчат - адна ці дзве касы з уплеценымі каснікамі, а галаўныя ўборы - перавязкі накшталт вузкіх ручнічкоў (скіндачка, шлячок), вянкі. Замужняй кабеце не дазвалялася паказвацца на людзях з непакрытай галавой. Адсюль - большая складанасць і разнастайнасць галаўных убораў. Па сваёй будове яны падзяляюцца на ручніковыя (намітка, сярпанка, хустка), рагацістыя (галовачка, сарока, рожкі), каптуровыя (каптур, чапец). Самы пашыраны і самы адмысловы ўбор - намітка. Яна мноствам спосабаў павівалася вакол галавы на спецыяльным каркасе, канцы яе прыгожа драпіраваліся на спіне, а постаць жанчыны атрымлівала выключную статнасць і велічнасць.

Будзённым абуткам жанчын служылі лапці, святочным - скураныя пасталы і чорныя хромавыя чаравічкі.

Верхняя мужчынская і жаночая вопратка мала адрознівалася паміж сабой. Яе шылі з валенага нефарбаванага сукна (світа, сярмяга, латушка, бурка, бурнос), аўчыны (кажух, кажушок, казачына). Дэкаратыўнасць найбольш выяўлялася ў святочных світах і кажушках, якія па-майстэрску кроіліся, упрыгожваліся шнурком, аплікацыяй, вышыўкай. Кажухі і кажушкі былі белыя недублёныя, пазней чырвона-вохрыстыя дублёныя.

Своеасаблівае люстра шматвяковага жыцця народа, касцюм беларусаў канца XIX - пачатку XX ст., усе яго формы не былі аднароднымі, як не было аднародным само сялянства, расслаенне на кулацтва і беднату сярод якога ішло ў гэты перыяд вельмі інтэнсіўна. Рост таварна-грашовых адносін, масавага адыходніцтва, пранікненне ў вёску прамысловых вырабаў размывалі "жанравыя" межы традыцыйнага народнага касцюма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Якраз на піку сваёй класічнай ураўнаважанасці ён зазнаў адчувальныя змены. Ды і ўнутраныя законы самога мастацтва выклікалі далейшыя зрухі, абнаўленне эстэтычных ацэнак. Моцны ўплыў гарадскога касцюма з яго тэндэнцыяй да спрашчэння і універсалізацыі форм, шырокае выкарыстанне тэхнічных фарбавальнікаў з яго тэндэнцыяй да паліхромнасці і расквечвання тканін і іншае прадракалі карэнныя пераўтварэнні народнага касцюма. Аднак з прычыны адсталасці матэрыяльнай базы, нізкага жыццёвага ўзроўню насельніцтва такія пераўтварэнні не маглі адбыцца.

Толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая непазнавальна змяніла ўсе сферы жыцця, народнае адзенне беларусаў уступае ў якасна новы этап развіцця. Адны віды і састаўныя часткі адзення выйшлі з ужытку, а тыя, што захаваліся, і тыя, што ўзніклі, сталі зручнымі і дасканалымі. Поруч з ільнянымі і шарсцянымі тканінамі распаўсюдзіліся баваўняныя, шаўковыя і іншыя. З'явіліся невядомыя раней матэрыялы, спосабы аздаблення. І мужчынскі, і жаночы касцюмы сталі багатымі, разнастайнымі, сугучнымі свайму часу.

У 20-30-я гады XX ст. шматколернасць і сакавітасць фарбаў пашыралі сферу бытавання на кашулі, фартухі, хусткі. Каларыт адзення рабіўся больш стракаты, спалучэнне колераў - больш смелае. Замест чыстых і глыбокіх тонаў пачалі прымяняць пераходныя. Гублялася семантыка традыцыйнага для Беларусі геаметрычнага арнаменту, усё большае месца адводзілася раслінным узорам. У строгую геаметрыю ўзорыстых тканін і вышывак урываюцца матывы, якія называюць: "ружы", "валошкі", "незабудкі", "званочкі", а дзе-нідзе паяўляюцца стылізаваныя выявы галубкоў, паўлінаў і іншыя заалагічныя матывы. Выкарыстоўваючы фарбавыя нюансы, майстрыхі дасягаюць каляровасветаценевага эфекту, і да сярэдзіны XX ст. акрэсліваецца новая ступень у развіцці мастацкіх сродкаў беларускага народнага касцюма: плоскасны малюнак набывае ілюзію аб'ёму.

Магутная матэрыяльна-тэхнічная база сацыялізму, няўхільны рост дабрабыту працоўных, павелічэнне вытворчасці тавараў народнага ўжытку, расшырэнне сеткі прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання абумовілі гістарычна апраўданае затуханне традыцый народнага касцюма. Але ён быў і застаецца невычэрпнай крыніцай натхнення, матываў і вобразаў для сучасных прафесійных творцаў, выдатным помнікам народнага дэкаратыўна- прыкладнога мастацтва.

Літаратура:

1. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст.: (паводле археал. звестак) / Л.У.Дучыц; Пад рэд. Г.В.Штыхава. – 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 80 с.: іл.
2. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
3. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
4. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.
5. Фальклор беларускі. Адзенне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://falklor.at.tut.by/adzenne/index.htm. – Дата доступу: 3.01.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 3.

## Асноўныя віды адзення. Плечавое і паясное адзенне.

## Традыцыйныя крої.

**Пытанні да тэмы:**

1. Плечавое адзенне. Мужчынская і жаночая кашуля. Крої кашуль.
2. Паяснае жаночае і мужчынскае адзенне. Крої.
3. Верхняе адзенне мужчын і жанчын.
4. Пояс, яго роля ў традыцыйным касцюме.

---

1. Галоўнымі часткамі адзення былі льняныя кашулі і паясное адзенне (панёва ў жанчын і порткі ў мужчын).

Кашулі рабіліся ніжнія і верхнія і па пакрою былі ў асноўным тунікападобныя. Паколькі шырыня вытканай тканіны звычайна не перавышала 45-53 см, то прыходзілася кроіць адзенне з некалькіх кавалкаў. Клінападобныя ўстаўкі пашыралі кашулю на падоле, а рамбічныя ластавіцы ўшываліся пад пахамі. Па баках нярэдка рабіліся разрэзы. Рукавы былі доўгімі, а ў святочных жаночых кашулях збіраліся каля запясця бранзалетамі. Каўняры стаячыя (вышыня 3-6 см), у форме карэ, трапецыі. Сярод стаячых сустракаюцца шаўковыя вышываныя. Такія каўняры збоку зашпільваліся на гузікі. Некаторыя каўняры рабіліся на падкладцы са скуры, лубу ці бярosты. У Панямонні на месцы шыі нябожчыцы знойдзены кавалачак скуры з нашытымі на яе бронзавымі спіральнымі пранізачкамі і паміж імі шкляным бісерам. Часцей за ўсё насілі кашулі, дзе разрэз быў пасярэдзіне грудзей. Каўнер завязваўся тасьмой або зашпільваўся гузікам ці фібулай (мал. 2). Сярод гузікаў даследчыкі вылучаюць тры тыпы: кляпікі, або кастылёвыя, пляската-выпуклыя і шарападобныя. Гузікі першых тыпаў выразаліся або выточваліся з дрэва ці косці, а гузікі трэцяга тыпу адліваліся ці штампаваліся з металаў [17]. Вядомы выпадкі знаходжання адзення з вялікай колькасцю гузікаў. Так, каля в. Ветачка Рагачоўскага раёна ў адным з курганоў знойдзены 34 бронзавыя гузікі. Часам замест гузікаў выкарыстоўваліся буйныя пацеркі, бразготкі, праселкі. Каўнер, краі кашулі і рукавоў упрыгожваліся вышыўкай, металічнымі пласцінкачкамі ці тасьмой. Таксама насілі і вязаныя карункі. У касцюме знаці былі распаўсюджаны накладныя каўняры (ажарэлкі), расшытыя жэмчугам. Як жаночыя, так і мужчынскія кашулі шыліся доўгімі. Калі жанчыны на кашулю надзявалі панёву або верхнюю сукенку, то мужчыны насілі кашулі навыпуск і абавязкова з поясам. Вядомы мужчынскія кашулі з падкладкай на грудзях і на спіне.

2. Панёва ў тыя часы, верагодней за ўсё, уяўляла сабой нясшыты кавалак тканіны, які завязвалі вакол пояса так, што краі разыходзіліся спераду, пакідаючы адкрытым падол кашулі.

Часта панёвы рабіліся з тканін у клетку ці палоску. Невялікая шырыня тагачасных тканін дазваляе меркаваць, што панёвы маглі шыцца з трох-, чатырох ці шасці полак. Трэба думаць, што насілі і панёвы з двух плахт, якія трымаліся з дапамогай пояса, а летам у час палявых прац адзіным відам жаночага паяснога адзення быў завязаны ззаду фартух [18]. Нясшытае паяснае адзенне ў пачатку 2-га тысячагоддзя вядома ў Прыбалтыцы [19]. Аб існаванні ў разглядаемы час на тэрыторыі Беларусі фартухоў прамых даных не існуе, але па знаходках бронзавых спіральных пранізак, якія складаюць узор, яны выразна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасочваюцца ў пахаваннях на пагранiччы з Лiтвой, у Лiтве i ў Карэлii. Хутчэй за ўсё нашы продкi тады ведалi i сарафаны, якiя складалiся са спаднiцы i кароткага лiфа на шлейках, што прышпiльвалiся фiбуламi. Такiя сарафаны добра вядомы ў лiваў, скандынаваў, iншых тагачасных народаў. Сярод знацi i багатых гараджан былi распаўсюджаны доўгiя сукенкi, аб чым яскрава сведчаць мiнiяцюры Радзiвiлаўскага летапiсу. Насiлi сукенкi i вяскоўцы. Напрыклад, у 1876 г. Г. Х. Татур каля в. Сеннiца паблiзу Мiнска ў кургане знайшоў не пашкоджаную шарсцяную сукенку цёмна-барвовага колеру, пакладзеную каля ног нябожчыцы. Захавалася сукенка дзякуючы таму, што была некалькi разоў абгорнута карой. На Барысаўшчыне каля в. Палееўка ў XIX ст. у адным з курганоў на грудзях жаночага шкiлета пад каралямi з вялiкiх бронзавых пацерак выяўлены 32 невялiкiя пласцiначкi, якiмi быў абшыты каўнер.

Мужчынскiм паясным адзеннем з'яўлялiся порткi. Па пахавальных помнiках яны не прасочваюцца, але, мяркуючы па выявах, порткi шылiся нешырокiмi. Яны кроiлiся з прамых палотнiшчаў i ў шаг ушывалася ластавiца. Пояс рабiўся шырокiм i завязваўся вакол талii [20]. Простыя людзi насiлi льняныя суконныя порткi, заможныя паверх надзявалi шаўковыя. Пра даўжыню портак казаць цяжка, паколькi на выявах яны паказваюцца звычайна запраўленымi ў боты або аакрытымi анучамi (абмоткамi), якiя часта ўпрыгожвалiся бронзавымi пранiзкамi (мал. 6).

3. Верхнiм адзеннем для жанчын i мужчын былi свiты, наплечныя пакрывалы (вiлайнэ), кажухi, шубы.

Свiты рабiлiся шарсцянымi i зашпiльвалiся на гузiкi - касцяныя, драўляныя цi металiчныя або фiбуламi. У адным з курганоў каля в. Перавоз Глыбоцкага раёна знойдзены чатыры бронзавыя з пазалотай гузiкi. Наплечныя пакрывалы ўяўлялi сабой кавалак тканiны памерам 60-80х100-130 см, якi звычайна зашпiльваўся фiбулай. У жанчын краi пакрывала ўпрыгожвалiся бронзавымi спiральнымi пранiзкамi цi трапецападобнымi падвескамi, вышывалiся шарсцянымi нiткамi або бiсерам. Мужчынскiя свiты i кажухi часта былi нераспашнымi [21]. Рэштки свiты знойдзены ў кургане каля в. Шо Глыбоцкага раёна, рэшткi ж кажухоў - у курганах каля в. Чаркасова на Аршаншчыне i каля Заслаўя пад Мiнскам. Пiсьмовыя крынiцы згадваюць аб шубах з меха мядзведзя, ваўка, лiсiцы, бабра, вавёркi i iнш. Больш заможныя людзi насiлi плашчы, якiя вядомы пад назвамi: корзна (княска-баярскi плашч, што насiўся з фiбулай), прывалока (кароткi плашч з парчы), ватола (безрукаўны плашч, якi зашпiльваўся каля шыi i часта меў капюшон), луда, (плашч з яркай, расшытай золатам парчы), мятль (плашч з вельмi дарагiх тканiн), кiса (плашч князёў i баяр) i iнш.

4. Важная роля ў касцюме адводзiлася поясу.

Яму звычайна прыпiсвалася якасць садзейнiчаць урадлiвасцi. Па павер'ях, пояс аберагаў ад хвароб, перагароджваў шлях нячыстай сiле. Паясы рабiлi скураныя, плеценыя з нiтак, тканыя, шытыя з тканiн, з залататканай тасьмы. Шырыня паясоў была 2, 3, 4 см. Некаторыя паясы рабiлiся на падкладцы з кары цi лубу. Большасць паясоў, якiя захавалiся, зашпiльвалася пры дапамозе металiчных спражак (мал. 8). На мужчынскiх паясах звычайна насiлi лiрападобныя спражкi або жалезныя прамакутныя, а на жаночых - падкаваподобныя спражкi (фiбулы) са спiралепадобнымi кандамi. Сярод спражак сустракаюцца вельмi каштоўныя. Так, у кургане каля Навагрудка знойдзена спражка з накладным серабром, арнаментаваная рэльефнымi кропкамi. Мужчынскiя скураныя паясы акрамя спражак мелi раздзяляльныя кольцы з металу або косцi i ўпрыгожвалiся бронзавымi заклёпкамi. Увагi заслугоўвае скураны пояс, знойдзены ў жаночым пахаваннi

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каля в. Відагошч (пас. Камсамолец) пад Мінскам. Да пояса былі падвешаны чатыры шнуры з шарсцяных нітак, кожны з якіх заканчваўся бразготкай. Шнуры былі перахоплены частымі абручыкамі з бронзавай бляхі. Больш заможныя людзі насілі залататканыя паясы. Паясы з накладкамі вядомы ў курганах каля вёсак Рудня Поладкага, Замошша Талачынскага, Шо Глыбоцкага раёнаў, каля Заслаўя і ў іншых месцах. Багата ўпрыгожваліся паясы ў княжацка-баярскім асяроддзі. Сярэбраныя паясныя накладкі вядомы ў скарбах (Стражавічы Чашніцкага раёна, Полацк і інш.). Паясы князёў і баяр лічыліся сімваламі храбрасці і багацця і перадаваліся ў спадчыну. Прыкладам плеценага пояса можа служыць кавалак ад пояса з кургана каля Заслаўя. Гэтым поясам быў падперазаны кажух на нябожчыку мужчыне. Пояс меў пляценне «ў касу». Насілі таксама і складанаплеценыя паясы, доказам чаго служыць касцяная вілачка для пляцення паясоў, знойдзеная ў адным з курганоў на Бабруйшчыне (мал. 9:9). Да паясоў на шнурках ці ландужках падвешваліся амулеты - бразготкі, падвескі-конікі, ключыкі і інш. Амулеты насілі як жанчыны, так і мужчыны. У мужчын да паясоў яшчэ падвешваліся крэсівы і асялкі. Часцей за ўсё сустракаюцца бразготкі. Па павер'ях, яны лічыліся эмблемай бога Перуна і ахоўвалі людзей ад злых духаў. Напрыклад, у Заслаўі ў адным з пахаванняў уздоўж скуранога пояса падвешана 16 бразготак. На адным са шнуркоў разам з бразготкай вісела сіняя шкляная пацерка. Насіліся на паясах і скураныя сумачкі, асабліва ў гарадах.

Літаратура:


1. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст.: (паводле археал. звестак) / Л.У.Дучыц; Пад рэд. Г.В.Штыхава. – 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 80 с.: іл.
2. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
3. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
4. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.
5. Фальклор беларускі. Адзенне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://falklor.at.tut.by/adzenne/index.htm. – Дата доступу: 3.01.2012.
6. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. –Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.


## Тэма 5.

## Сялянскі касцюм і яго рэгіянальныя асаблівасці.

**Пытанні да тэмы:**

1. Асноўныя комплексы і лакальныя разнавіднасці беларускага народнага адзення.
2. Асноўныя комплексы Брэсцкага Палесся.
3. Асноўныя комплексы Гомельскага Палесся.
4. Асноўныя комплексы Магілёўскага Падняпроўя.
5. Асноўныя комплексы Цэнтральнай Беларусі.
6. Асноўныя комплексы Віцебскага Паддзвіння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Мелодыя беларускага народнага адзення шматгалосая. Адзінства ў шматграннасці выяўляецца ў ім на ўсёй этнічнай тэрыторыі беларусаў і найбольш рэльефна ў жаночым касцюме.

Паводле таго, з чым насілася кашуля (а ў сярэдзіне XX ст. блуза) у летнім убранні, у ім вылучаюцца чатыры асноўныя комплексы: са спадніцай (андарак, палатнянік) і льняным фартухом; са спадніцай (андарак, палатнянік), ільняным фартухом і гарсэтам (насілі яго і самастойна); са спадніцай (саян, андарак), да якой прышыты ліф-гарсэт, і льняным ці паркалёвым фартухом; з панёвай (тыпу плахты ці фартуха-запаскі), суконным фартухом, гарсэтам і поясам. Першыя два комплексы вядомы на ўсёй Беларусі, два другія - ва ўсходніх і паўднёва-ўсходніх раёнах. Кожны з іх па-свойму адлюстроўвае эвалюцыю касцюма ад старажытных, пазбаўленых крою адзежын з прамавугольных кавалкаў тканіны, да вытанчаных форм з багатай "інкрустацыяй" фальбонамі, складкамі, вытачкамі, швамі. У кожным адбіліся таксама асаблівасці побыту пэўных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, такіх, як Заходняе і Усходняе Палессе, Прыдняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Наддзвінне.

Комплексы маюць шэраг разнавіднасцей, якія ўвасабляюць стылёвыя прынцыпы народнай творчасці ў тых ці іншых кутках Беларусі. Гэтыя лакальныя разнавіднасці і вылучаюцца як асобныя тэрытарыяльныя строі. Яны адрозніваюцца толькі асобнымі элементамі касцюма, характарам аздаблення (тэхнікай выканання арнаменту, яго сюжэтам, матывамі), каларытам, а таксама спосабамі нашэння частак касцюма. Геаграфічныя межы строяў выражаны не рэзка, бо былі зменлівыя ў розныя часы і залежалі ад сацыяльна-эканамічнага ўзроўню развіцця мясцовасці, прыродна-кліматычных умоў, якія ўплывалі на дыферэнцыяцыю гаспадаркі, адміністрацыйнага, царкоўнага і прыватнаўласніцкага падзелу тэрыторыі, кантактаў з насельніцтвам іншых нацыянальнасцей і г. д.

2. Асноўныя комплексы Брэсцкага Палесся.

Беларускае Палессе - непаўторны ў прыродных і этнаграфічных адносінах край - край песень і казак, легенд і паданняў, а касцюм яго - жамчужына беларускага народнага мастацтва. Тут збераглося поўныя хараства і мудрасці народныя ўборы, сама традыцыя апранацца ў самаробнае, маляўніча аздобленае адзенне. Менавіта на Палессі лакалізуюцца мастацкія асаблівасці з'яў, невядомых у іншых мясцінах Беларусі. Так, толькі на Брэстчыне сустракаецца цяжкая, з воўны спадніца - бурка, толькі тут яшчэ ў 30-50-я гг. нашага стагоддзя маладзіцы ўвіваліся акалястымі наміткамі - платамі, а свахі на вяселлі ўбіраліся ў "рожкі" ці "кветкі"-галаўныя ўборы з пукамі фарбаванага пер'я.

*Кобрынскі строй* вызначаецца манументальнасцю і класічнай завершанасцю форм, віртуознай распрацоўкай арнаменту, велічнасцю і стройнасцю (дзякуючы кужэльнай намітцы) касцюма жанчын.

*Пінска-Івацэвіцкаму строю* ўласцівы прастата форм, чысціня ліній і сілуэта. *Мотальскі строй* выступае варыянтам Пінска-Івацэвіцкага. Вылучаецца белізной і тонкасцю кужалю, стрыманасцю арнаменту.

*Дамачоўскі строй* цікавы стройнасцю і выразнасцю прыталенага сілуэта, сакавіта-мажорнай напружанасцю каларыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Маларыцкі строй* адметны архаічнымі элементамі адзення і галаўных убораў, маштабнасцю прапорцый, скульптурнай яснасцю ансамбля.

3. Асноўныя комплексы Гомельскага Палесся.

Багаццем сродкаў мастацкага афармлення касцюма, разнастайнасцю старадаўніх і сучасных форм Усходняе Палессе не ўступае Заходняму. Вобразна-пластычнымі асаблівасцямі адзення яно блізкае да Цэнтральнай Беларусі і Прыдняпроўя.

*Калінкавіцкі строй* - адна з вяршынь мастацтва беларускага народнага касцюма. Ён урачыста-маляўнічы і ў той жа час стрыманы, зачароўвае мяккай паэтычнасцю і вытанчанасцю густу.

*Брагінскі строй* багаты разнастайнасцю форм паяснога адзення і шыйных упрыгожанняў, выкарыстаннем раслінных узораў у арнаменце.

*Турава-Мазырскі строй* характарызуе стан нацыянальнага касцюма сярэдзіны XX ст. У ім шмат сучасных форм з паркалю, саціну; каларыту адзення ўласціва паліхромнасць, вышытыя гладдзю раслінныя ўзоры, якія ствараюць ілюзію аб'ёму.

У *Давыд-Гарадоцка-Тураўскім строі* раскрываюцца архаічныя рысы касцюма тутэйшых местачкоўцаў. Своеасаблівую фантастычнасць і самавітасць надавалі яму арыгінальныя галаўны ўбор галовачка, гарсэт, ахоплены шырокім поясам, доўгая спадніца сукня, ускладнёныя здымныя ўпрыгожанні.

4. Асноўныя комплексы Магілёўскага Падняпроўя.

Вялікі водны шлях па Дняпры, этнаграфічнае сумежжа трох брацкіх народаў - беларусаў, рускіх і ўкраінцаў, узаемнае ўзбагачэнне культур садзейнічалі ўтварэнню ў Прыдняпроўі змешаных тыпаў касцюма. Тут замацаваліся таксама невядомыя ў іншых рэгіёнах тэхнікі ўзорыстага ткацтва (закладная), вышыўкі (гафт, тамбурнае шво), прыём маршчэння (збіранне тканіны ў гафрыраваныя складкі). У арнаменце сустракаюцца матывы дрэва жыцця, пальметы; вышыўка чырвонага або чырвона-чорнага колеру суседзіць з ахраматычнай гамай белага ці чорнага ўзору на серабрыста-белым фоне палатна.

*Магілёўскі строй*, у якім былі два комплексы (кашуля, спадніца і фартух; кашуля, спадніца, фартух і гарсэт), сціплы і просты паводле аздаблення. Маляўніча павіваліся наміткі і саматканыя хусткі.

*Буда-Кашалёўскі строй* адрозніваецца белым ці чорным каларытам вышывак, інтэнсіўным маршчэннем, гафтаваннем. Шырокія рукавы кашулі, неаздоблены чорны гарсэт ствараюць эпічны і выразны сілуэт касцюма.

*Краснапольскі строй* вабіць багаццем кампазіцыйна-арнаментальных вырашэнняў. Кашулі ў ім кроіліся звычайна з гесткай, комплекс са спадніцай і прышыўным ліфам-гарсэтам нагадвае сарафан.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Неглюбскаму строю* ўласцівы комплекс з панёвай (тыпу платы), агульнае ўражанне ад якога - мажнасць і статнасць. У дзявочы гарнітур уваходзілі паясная адзежына калышка, галаўны ўбор кубак.

5. Асноўныя комплексы Цэнтральнай Беларусі.

У цэнтральнабеларускіх строях найбольш яскрава выяўляецца стрыманасць і паэтычнасць нацыянальнага касцюма. Народныя майстры цураюцца, пазбягаюць знешняй эфектнасці і імпазантнасці вырабаў, імкнуцца да ўнутранай цэльнасці, гатычнай манументальнасці і тонкай выразнасці ансамбля.

У *Пухавіцкім строі* адлюстроўваюцца класічна- традыцыйныя прынцыпы мастацкага вырашэння адзення Цэнтральнай Беларусі: стройнасць і некаторая выцягнутасць лініі фігуры, ашчаднае, але змястоўнае аздабленне.

Гарманічную ўраўнаважанасць *Капыльска-Клецкаму* строю прыдавалі чырвоны каптур, зялёны або цёмна-сіні гарсэт, вясёлкавыя пераліvы андарака, прастата і яснасць арнаменту.

Вобразная сістэма *Слуцкага строю* - у вялікіх, нібы буслянка, галаўных уборах (адмыслова павітая хустка), доўгіх цёмных гарсэтах, у амаль поўнай адсутнасці натыкання і вышыўкі.

Вышыўка не адыгрывае вялікай ролі і ў *Вілейскім строі*, дзе народныя майстры як мага паўней выкарыстоўвалі прыродныя якасці льну, сукна ці крамных тканін. Прыкметнымі часткамі адзення былі тут аксамітны ці шаўковы каптур і суконны бурнос.

*Ляхавіцкі строй* уражвае арыгінальнасцю і маляўнічасцю жаночых галаўных убораў (падвічка, намітка ці хустка, аздобленая пукамі зеляніны, букетамі кветак), сакавіта-напружанымі колерамі андаракаў і спадніц-выбіванак, разнастайнымі шыйнымі, нагруднымі і наспіннымі ўпрыгожаннямі (пацеркі, стужкі, абразкі).

6. Асноўныя комплексы Гродзенскага Панямоння.

Касцюм Панямоння мае шмат агульнага з цэнтральнабеларускім. Назіраецца схільнасць, асабліва ў паясным адзенні, да зялёнага і валошкавага колераў. Касцюм гэтага рэгіёна рана зазнаў уплыў гарадской моды, што адбілася ў спецыфіцы верхняй вопраткі.

*Ваўкавыска-Камянецкі строй* - узор выключнай адпаведнасці крою і аздаблення касцюма постаці чалавека. Дынамічнасць і ўзнёсласць мастацкага вобраза дасягалася каскадам складак андарака, світкі і выбеленага кужалю наміткі.

Адметныя часткі *Навагрудскага строю* - кашуля-гарсоўка, чорны з кляпамі баскі гарсэт, кароткая з белага сукна абціслая курта (жакетка). У аздабленні вытрымліваецца своеасаблівы рытм і маштаб дэталей.

*Мастоўскі строй* спалучае сакавітасць тонаў цёмна-сіняга ці малінавага андарака з адносна беднай распрацоўкай арнаменту. Выразная частка касцюма - кароткая курта (разнавіднасць світы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Асноўныя комплексы Віцебскага Паддзвіння.

У параўнанні з іншымі рэгіёнамі Наддзвінне найменш захавала старадаўнія і традыцыйныя формы адзення. З прычыны геаграфічных і сацыяльна-эканамічных фактараў тут у сярэдзіне XX ст. распаўсюдзіўся касцюм накшталт гарадскога, а ў вырабе тканін - ручная набойка. Менавіта набойка істотна паўплывала на вобразна-пластычны і арнаментальна-каларыстычны лад касцюма. У строях наглядаецца ўлюбёнасць у блакітны колер і дробнаклятчасты ўзор у паясным адзенні. Асноўным з'яўляўся комплекс з прышыўным ліфам, у асобных раёнах - сарафан. Абавязковым кампанентам жаночага гарнітура быў фартух.

*Дубровенскі строй* мае даўні (са спадніцай, ільняным фартухом і куртай - безрукаўка з сукна, пацягненага белым каленкорам) і больш позні (са спадніцай, прышыўным ліфам і поясам) комплексы. Чырвона-бардовы колер вышывак часта дапаўняецца блакітным і жоўтым.

*Лепельскі строй* характарызуецца спалучэннямі белага, блакітнага, вохрыста-жоўтага і чорнага колераў у аднатонных ці пярэстатканых спадніцах, лагічнай кампазіцыяй дэкору і яснай архітэктонікай.

Мастацкая спадчына беларускага народнага адзення яркая і непаўторная. Неад'емная частка духоўных здабыткаў нацыі, яна дапамагае фарміраваць культурны воблік сучасніка, плённа паслужыць новым пакаленням. Беларусь, якая заняла "свой пачэсны пасад між народамі" (Я. Купала), ганарыцца сваёй спадчынай па праву, па высокаму сыноўняму абавязку.

Літаратура:


1. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
2. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
3. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 6. ТЭМАТЫКА І МЕТАДЫЧНЫЯ УКАЗАННІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

**Тэма 2.**

**Тканіны, колеры, арнаментыка, вышыўка.**

Студэнты павінны навучыцца адрозніваць традыцыйныя даматканыя тканіны ад сучасных фабрычных, засвоіць колеравую гаму традыцыйнага беларускага адзення. Вышыўка: віды ўпрыгожваючых швоў, тэхніка іх выканання. Арнаменты на беларускім народным адзенні.

Літаратура:

1. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.

**Тэма 3.**

**Асноўныя віды адзення. Плечавое і паясное адзенне.**

**Традыцыйныя крої.**

Студэнты павінны засвоіць віды плечавога і паяснога адзення традыцыйных беларускіх мужчын і жанчын, а таксама засвоіць традыцыйныя крої гэтага адзення. Асабліва трэба звярнуць увагу на варыянты традыцыйнага крою кашуль. Студэнты павінны навучыцца правільна апранаць беларускі касцюм (паккуль што без галаўнога ўбора).

Літаратура:

1. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
2. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.

3. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
4. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. –Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 4.**

**Галаўныя уборы, упрыгожванні і рэчы туалету.**

**Абутак.**

Студэнты павінны засвоіць віды галаўных убораў мужчынскага і асабліва жаночага стряў, якія упрыгожванні і аксэсуары насілі беларусы. Прагляд відэаматэрыялаў дапаможа засвоіць спосабы навівання намітке і неглюбскага плата. Традыцыйны скураны абутак. Апрананне намiткі і хусткі на дзяўчат. Апрананне цэлага строю.

Літаратура:


1. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст.: (паводле археал. звестак) / Л.У.Дучыц; Пад рэд. Г.В.Штыхава. – 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 80 с.: іл.
2. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
3. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.
4. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
5. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. –Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.


**Тэма 6.**

**Народныя строі Віцебскага Падзвіння.**
**Народныя строі Магілёўкага Падняпроўя**

Студэнты павінны засвоіць некаторыя мясцовыя комплексы адзення двух гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. А таксама скласці праект рэканструкцыі аднаго з такіх комплексаў.

Літаратура:


1. 1. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
2. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
3. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б.Варфаламеева, В.І.Басько, М.А.Козенка і інш. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 797 с.: іл., нот. іл.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне. / Т.Б.Варфаламеева, А.М.Боганева, М.А.Козенка і інш.; Складальнік Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 910 с.: іл., нот. іл.

## Тэма 7.

## Народныя строі Брэсцкага Палесся. Народныя строі Гомельскага Палесся.

Гл. Тэму 6.

Літаратура:

1. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
2. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
3. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А.М.Боганева [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б.Варфаламеевай. – Мн.: Выш. шк., 2009. – 863 с.: каляр. іл., 1 электрон.-апт. Дыск (CD-Rom).

## Тэма 8.

## Народныя строі Гродзенскага Панямоння і Цэнтральнай Беларусі.

Гл. Тэму 6.

Літаратура:

1. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: ил.
2. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне: Альбом / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 234 с.: іл
3. Раманюк, М. Беларускія народныя строі: Альбом / М.Ф.Раманюк; Уклад. Д.М.Раманюк. – Мн., 2003. – 80.с.: іл.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А.М.Боганева [і інш.]; аўт. ідэі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Т.Б.Варфаламеева; агул. рэд. Т.Б.Варфаламеевай. – Мн.: Выш. шк., 2006. – 736 с.: каляр. іл.

**Тэма 9.**

**Касцюм гараджан. Касцюм знаці.**

Студэнты павінны засвоіць, як выглядаў касцюм знаці і гараджан па апісаннях у друкаваных крыніцах, і намаляваць любы з гэтых касцюмаў. А тксама заўважыць некаторыя ўзаемапранікненні элементаў гарадсткога касцюма ў народны.

Літаратура:


1. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X – XIII стст.: (паводле археал. звестак) / Л.У.Дучыц; Пад рэд. Г.В.Штыхава. – 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 80 с.: іл.


**Тэма 10.**

**Музейныя калекцыі беларускага народнага адзення.**

Экскурсія і прагляд калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі , замацаванне ведаў па асноўным комплексам народнага адзення, а таксама упрыгожванням і іншых рэчах туалету традыцыйных жыхароў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 7. МАТЭРЫЯЛЫ ДЫДАКТЫЧНАГА ХАРАКТАРУ

Ў рабоце выкарыстоўваюцца альбомы традыцыйнага адзення Беларусаў, народныя касцюмы і асобныя прадметы адзення з прыватных калекцый фалькларыстаў, а таксама рагляд музейных калекцый.